СА СВЯТАМ, ДАРАГІЯ СЯБРЫ!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 13 (847) ● Пятніца, 28 красавіка 1972 г. ● Год выдання XXV ● Цана 2 кап.

Свята Першамая ўжо валодае думкамі і справамі вялікага універсітэцкага калектыву. На факультэтах рыхтуюцца да выпуску святочныя нумары насценных газет, наладжваюцца вечары, канцэрты, цікавыя сустрэчы.

І ў той жа час ідзе напружаная вучоба. Набліжэнне сесіі прымушае студэнтаў настойліва рыхтавацца да практычных і семінарскіх заняткаў, больш часу праводзіць у кабінетах і бібліятэках. Спяшаюцца завяршыць свае даследаванні дыпломнікі. Шмат работы і клопатаў у гэтыя дні ў выкладчыкаў і супрацоўнікаў.

Няхай усім вам, дарагія сябры, спадарожнічае поспех! Са святам!

ПА УНІВЕРСІТЭТУ

Нядаўна партком, камітэт камсамола і прафком універсітэта прымалі гасцей — рэдактараў піянерскіх газет сацыялістычных краін.

***

Удзельнікі Усесаюзнага занальнага семінара першых сакратароў гаркомаў і райкомаў камсамола наведалі наш універсітэт. У час гутаркі у парткоме яны пазнаёміліся з гісторыяй універсітэта. Аб рабоце з моладдзю расказаў намеснік сакратара парткома М. Д. Ціва. Размова таксама вялася аб ваенна - патрыятычным выхаванні, рабоце па прафарыентацыі. Затым госці наведалі кабінет гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў, новы інтэрнат па вуліцы Кастрычніцкай.



Апошнія ўдакладненні і праверкі па дыпломнай рабоце праводзіць у лабараторыі электрафізіялогіі студэнтка пятага курса З. Лісейчыкава.

Фота *Д. Чаховіча.*

САВЕЦКІЯ ЮНАКІ І ДЗЯЎЧАТЫ! НАСТОЙЛІВА АВАЛОДВАЙЦЕ ВЯЛІКІМ РЭВАЛЮЦЫЙНЫМ ВУЧЭННЕМ МАРКСІЗМУ-ЛЕНІНІЗМУ, ВЫШЫНЯМІ НАВУКІ, ТЭХНІКІ І КУЛЬТУРЫ! БУДЗЬЦЕ Ў ПЕРШЫХ РАДАХ БАРАЦЬБІТОЎ ЗА ПАСПЯХОВАЕ ВЫКАНАННЕ РАШЭННЯЎ XXIV З'ЕЗДА КПСС!

(З Заклікаў ЦК КПСС да 1 Мая 1972 года).

З ДУМАЮ ПРА ЛЕНІНА

Дзень нараджэння У. І. Леніна ва універсітэце з'явіўся справаздачным днём для камсамолії. Амаль на ўсіх факультэтах былі падведзены вынікі II этапа Ленінскага заліку. Прайшлі групавыя сходы на ФПМ, факультэце агульнай матэматыкі. Прычым на апошнім лепшым аказаўся IV курс, дзе кожны трэці здаў залік на выдатна. Дакладна прайшоў залік на I курсе гэтага ж факультэта.

У філолагаў адбыліся курсавыя сходы. А біёлагі ў гэты дзень сабраліся ўсім факультэтам у актавай зале галоўнага корпуса, каб паслухаць лекцыю дацэнта Г. Г. Герасіменкі аб Леніне як чалавеку.

Агульнафакультэцкі ўрачысты сход адбыўся таксама на гістарычным факультэце.

У гэты дзень у госці да сваіх шэфаў прыйшлі вучні школы № 1 Кастрычніцкага раёна г. Мінска. На ўрачыстым зборы акцябрат прынялі ў піянеры. Юных ленінцаў ад імя шэфаў віншаваў студэнт фізфака У. Галубовіч. Затым школьнікі паглядзелі фільм аб універсітэце.

Л. ДРУЗЕВА.
(Прэс-цэнтр камітэта камсамола.)

ДЗЕЦІ РОЗНЫХ НАРОДАЎ

У дзень 102-й гадавіны з дня нараджэння У. І. Леніна на падрыхтоўчым факультэце для замежных студэнтаў адбыўся вечар рускай мовы пад дэвізам «Дзеці розных народаў — мы марай аб міры жывём».

Вечар адкрыла загадчыца кафедры рускай мовы гэтага факультэта Т. П. Плешчанка.

— З пачатку заснавання факультэта, — сказала яна, — на працягу 11 гадоў мы праводзім штогод такія вечары. Сёлета на нашым факультэце вучацца прадстаўнікі з 8 краін свету. І таму сённяшні вечар сапраўды інтэрнацыянальны. А прысвячаем мы яго 102-й гадавіне з дня нараджэння вялікага правадыра сусветнага пралетарыяту і Міжнароднаму дню салідарнасці моладзі.

Затым Таіса Паўлаўна аб'явіла пераможцаў конкурсу сачыненняў, прысвечаных У. І. Леніну. Першыя месцы занялі в'етнамскі студэнт До Чонг Бінь і студэнт з Кубы Рауль Корціна.

На вечары прагучаў літаратурна - музычны мантаж аб жыцці і дзейнасці У. І. Леніна. Прадстаўнікі розных краін свету чыталі вершы савецкіх паэтаў аб вялікім правадыру. Затым адбыўся канцэрт мастацкай самадзейнасці. Замежныя студэнты выказалі глыбокую павагу чалавеку, які азарыў усім народам свету вялікую дарогу дружбы, міру і свабоды.

В. КАЛАДЗІНСКІ.

ПРЫЯЗДЖАЙЦЕ Ў НАШ МУЗЕЙ

22 красавіка 1972 года нашаму ленінскаму музею споўнілася роўна 12 год. За гэты час яго наведала каля 50 тысяч экскурсантаў — навучэнцаў, рабочых, калгаснікаў, служачых, студэнтаў. Сярод многіх экспанатаў музея (некаторыя з іх з'яўляюцца унікальнымі) захоўваюцца і матэрыялы аб 50-годдзі вашага універсітэта, у тым ліку і памятны медаль у гонар гэтай падзеі.

Ад усёй душы запрашаем: прыязджайце ў наш музей. Заўсёды будзем рады бачыць у старэйшым школьным ленінскім музеі рэспублікі студэнтаў старэйшай вну Беларусі, якая носіць імя У. І. Леніна.

Савет музея У. І. Леніна Мар'інагорскай сярэдняй школы № 3 Мінскай вобласці.

АДРАС ВЫСТАЎКІ — ІЕНА

На днях да нашых сяброў у Іенскі універсітэт імя Ф. Шылера (ГДР) адпраўляецца вялікая фотавыстаўка «50 год Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна».

Многія памятаюць сваё знаёмства з універсітэтам імя Ф. Шылера па выстаўцы, разгорнутай у галоўным корпусе БДУ да 20-годдзя Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі ў 1969 годзе. Тады беларускія студэнты, выкладчыкі, супрацоўнікі з вялікай цікавасцю знаёміліся з пастаноўкай вышэйшай адукацыі у ГДР, з вучэбнай і навуковай дзейнасцю аднаго са старэйшых універсітэтаў Еўропы. А цяпер у Іене Беларусь будзе прадстаўлена сваёй буйнейшай вну.

Выстаўка аб нашым універсітэце складаецца з сямі раздзелаў: «Універсітэт за 50 год», «Вучэбны працэс», «Вытворчая практыка і працоўнае выхаванне студэнтаў», «Навуковая праца супрацоўнікаў і студэнтаў», «Мастацкая самадзейнасць і спартыўнае жыццё», «Адпачынак супрацоўнікаў і студэнтаў», «Зарубежныя сувязі». Тэкставыя планшэты паведамляюць аб падзеях і фактах, а вялікія фотаздымкі багата ілюструюць шматграннае жыццё калектыву БДУ.

Наведвальнікі выстаўкі даведаюцца аб тым, што ва універсітэце працуе 90 прафесараў, 439 дацэнтаў, каля 600 выкладчыкаў і асістэнтаў. У СНТ вядуць даследаванні 2.800 студэнтаў. Восем калектываў мастацкай самадзейнасці, сярод іх тры народныя, прадстаўляюць шматлікіх артыстаў-аматараў на аглядах і конкурсах. 28 відаў спорту культывуецца ў БДУ. Падрыхтавана чатыры майстры спорту міжнароднага класа і 83 майстры спорту СССР. Навуковыя кантакты БДУ ўстаноўлены з многімі зарубежнымі вну: Сафійскім, Люблянскім, Варшаўскім, Кракаўскім універсітэтамі, вну Англіі, Францыі, Індыі і іншых краін.

Стварэнню такой рознабаковай выстаўкі папярэднічала вялікая работа рэктарата БДУ, фотаздымкі зроблены супрацоўнікам універсітэта, членам Саюза журналістаў СССР Д. Р. Прэсам.

Узначальвае дэлегацыю, якая павязе выстаўку ў ГДР, дэкан хімічнага факультэта Ф. М. Капуцкі.

У першай майскай дэкадзе універсітэцкая выстаўка прадстане перад нашымі сябрамі ў Іене.

А. АЛЕНІЧ.

Камсамольскае жыццё

ЗАЛІК ПРАЙШОЎ ПАСПЯХОВА

На фізічным факультэце ідзе Ленінскі залік. Хутка можна будзе падвесці вынікі. А пакуль давайце зойдзем на залік у 9-ю групу чацвёртага курса, дзе камсоргам В. Хацкевіч.

Трэба сказаць, што камітэт камсамола стаў больш сур'ёзна адносіцца да саставу камісій, якія прымаюць Ленінскі залік. У кожную з іх уваходзяць куратары, члены камітэта камсамола факультэта, бюро патока. А гэта ў сваю чаргу значна павысіла патрабавальнасць камісій і адбілася на атмасферы правядзення Ленінскіх залікаў.

Наглядна пацвердзіў гэтыя змены залік у 9-й групе. Камісія, якую ўзначальваў намеснік сакратара камітэта камсамола А. Мінько, строга падыходзіла да абавязкаў, звязаных з грамадскай і камсамольскай работай. Так што добрыя адзнакі і акуратнае наведванне заняткаў не выручылі цяпер тых, хто абыякавы да грамадскай працы. І асноўная прычына, па якой у групе было перанесена некалькі залікаў,—нядбайныя адносіны да грамадскіх спраў. Але ў асноўным у групе залік прайшоў паспяхова.

Некаторыя камсамольцы з'яўляюцца членамі камітэта, бюро патока і добра вядуць сваю работу. Многія прымаюць актыўны ўдзел у грамадскім жыцці факультэта, удзельнічаюць у агітбрыгадах, выступаюць з лекцыямі. Гэта С. Бліноў, М. Баркоўскі, С. Буруноў, Т. Сушчэўская і іншыя. Уся група вядзе перапіску са студэнтамі Іенскага універсітэта (ГДР).

Паспяховасць і наведванне тут добрыя, ва ўсякім разе камісіі не прыйшлося засяроджваць увагу на гэтым. Рэгулярна праводзяцца палітінфармацыі. Радуе сур'ёзнасць падыходу чацвёртакурснікаў да самастойнага вывучэння работ класікаў марксізму-ленінізму, у прыватнасці такой складанай і вельмі важнай для фізікаў, як «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм».

Ленінскі залік дапамог групе прааналізаваць свой удзел у камсамольскім жыцці факультэта, патока, выявіць больш адказныя адносіны да грамадскай працы.

Бюро патока вырашыла дапамагчы групе замацаваць тыя зрухі, што адбыліся ў ёй.

Н. САЛУК.

ПРАВЯРАЮЧЫ СЯБЕ НА ПРАКТЫЦЫ

Быццам гаманлівы паток, запаўняюць вестыбюль універсітэта студэнты. Сярод іх і будучыя гісторыкі. Чуюцца ўзбуджаныя галасы: яшчэ вядуцца спрэчкі, яшчэ абмяркоўваюцца пытанні дня. Проста нельга застацца абыякавым пасля факультэцкага сходу, на якім падводзіліся вынікі Ленінскага заліку.

Старшыня камісіі па прыёму камсамольскага экзамена прафесар Л. М. Шнеерсон адзначыў, што Ленінскі залік, які стаў ужо добрай традыцыяй, прайшоў паспяхова. Яго ахвотна падтрымаў і гаважаны госць сходу, удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі Іосіф Анісімавіч Кажанкоў, які падзяліўся з прысутнымі сваімі ўспамінамі і звярнуў асаблівую ўвагу на практычны бок вывучэння марксісцка-ленінскай тэорыі ў нашы дні. Добрым прыкладам тут могуць служыць студэнцкія навуковыя работы, выкананыя на кафедры гісторыі КПСС і атрымаўшыя высокую адзнаку на рэспубліканскім аглядзе-конкурсе і прапанаваныя на Усесаюзны. Гэта «Па законах пралетарскага інтэрнацыяналізму» Л. Пятручык (навуковы кіраўнік дацэнт І. О. Царук), «Павышэнне ролі партыі ва ўмовах развітага сацыялістычнага грамадства» І. Русакова (навуковы кіраўнік дацэнт А. М. Малашка) і шэраг іншых.

— Але мы не толькі вучымся, мы, выконваючы ленінскі запавет, стараемся спалучаць тэарэтычныя веды з практычнай дзейнасцю, — падкрэсліў сакратар камітэта камсамола гістфака М. Мурашка.—І добра дапамагаюць нам у гэтым студэнцкія будаўнічыя атрады, якія ў трэцім працоўным семестры выедуць на Урал, у Гомельскую вобласць, будуць працаваць у нашым горадзе. Ёсць і спецыяльная брыгада «Рэстаўратар». Яна створана па ініцыятыве саміх студэнтаў і існуе ўжо чацвёрты год. У ёй будучыя спецыялісты займаюцца вельмі важнай і патрэбнай справай — аднаўляюць помнікі мінулага.

Усім вядома, што без песні, музыкі, захапляючай справы моладзі не абысціся. Аб гэтым зараз і думаюць у камітэце камсамола. І каб з першых жа дзён агітбрыгады працавалі зладжана, студэнты загадзя рыхтуюць афармленне для ленінскага кутка, падбіраюць матэрыялы для лекцыйных выступленняў.

Працоўнае лета не за гарамі. Да яго рыхтуюцца, яго чакаюць. Хутка шырокія саўгасныя палі скажуць «добры дзень!» першым атрадам студэнтаў.

Т. ЖАЛУДКО.

ТРЭЦІ ПРАЦОЎНЫ НА ПАРОЗЕ

Актыўны ўдзел у трэцім працоўным семестры прымаюць студэнты юрыдычнага факультэта. Сёлета сфарміраваны чатыры атрады, якія будуць працаваць у Томскай, Уральскай, Мінскай абласцях і ў горадзе Мінску. Камітэт камсамола зацвердзіў камандзіраў і камісараў усіх атрадаў. Напрыклад, камандзір Томскага атрада «Феміда-1» Міша Ніканоранкаў, студэнт III курса, узначаліць працоўную дружыну трэці раз. Грыша Кацуба — камісар атрада, таксама мае пэўны вопыт работы.

Добра папрацавалі два выязныя атрады ў мінулым годзе ў Чапаеўскім раёне Уральскай вобласці. Студэнты здалі ў эксплуатацыю два інтэрнаты на 60 месц, пяць двухкватэрных дамоў, капітальна адрамантавалі дзве школы. Байцы датэрмінова выканалі фронт даведзеных работ і асвоілі каля 300 тысяч рублёў капіталаўкладанняў. Аднак не толькі будаўнічымі поспехамі славіцца трэці студэнцкі семестр. Яшчэ ў памяці кожнага цікавыя лекцыі, спартыўныя гульні, канцэрты. Добры кантакт быў наладжан са школьнікамі пасёлкаў Міргенева і Першамайскі. Студэнты пабудавалі стадыён, на якім разам з вучнямі праводзілі спартыўныя гульні. Мясцовая дзетвара заўсёды была пад наглядам старэйшых сяброў.

Надоўга запомнілася ўсім свята — Дзень будаўніка. Яшчэ задоўга пачаліся рэпетыцыі. Хацелася выступіць як мага лепш.

— Да таго ж, — расказвае камісар атрада Валерый Свірыдаў, — мы былі носьбітамі беларускага мастацтва. У святочны вечар прыйшлі паслухаць канцэрт старыя і малыя. Хваляванне было ва ўсім. А ці зразумеюць беларускую мову казахі, татары, чачэнцы? Але потым выявілася, што нас разумелі ўсе, бо многія нумары выконвалі на біс.

— Ой, як хорэша спяваюць, малайцы, — ціха прамовіла жанчына, якая сядзела побач з нашай дзяўчынай. — Першы раз чую мову беларусаў, а ўсё зразумела.

— Шмат апладысментаў выпала на долю самадзейных артыстаў. Доўга ўспаміналі жыхары наш канцэрт,— дадае Галіна Лашэвіч.

Зараз на факультэце амаль поўнасцю завершана арганізацыйная работа. На апошнім сходзе створаны рэдакцыі насценных газет, назначаны адказныя за культурна-масавую работу. Штаб працоўных спраў юрфака галоўнай задачай лічыць паспяховую здачу Ленінскага заліку і летняй сесіі.

Сёлета ўся краіна будзе адзначаць паўвекавы юбілей з дня ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Таму лектарская група падбірае тэмы дакладаў, лекцый, каб глыбей пазнаёміць мясцовых жыхароў з тымі зменамі, што адбыліся ў рэспубліцы за 50 гадоў. Гэта будзе змястоўны расказ і аб старэйшай навучальнай установе— БДУ імя У. І. Леніна.

«Трэці працоўны — на выдатна!» — такі дэвіз усіх атрадаў факультэта.

Ф. САГАНОВІЧ.

Чым бліжэй лета, тым больш клопатаў у камісара і начальніка штаба працоўных спраў БДУ — М. Ніканоранкава і У. Адамушкі.

ПРОСТА... І ВЫДАТНА

Калі даводзіцца бываць на гістарычным факультэце, нельга не звярнуць увагу на дошку выдатнікаў. Аднойчы каля яе мы сустрэліся з камсамольскім важаком студэнтаў Міхаілам Мурашкам. Я папрасіў пазнаёміць мяне з кім-небудзь з выдатнікаў.

— Кажаш, каб выдатнік і грамадскіх спраў саратнік? Вось, далёка хадзіць не будзем. Першая ў вучобе і першая на дошцы, — паказаў сакратар на партрэт дзяўчыны з задуменным позіркам, — Люба Ахроменка.

З Любай давялося сустрэцца толькі праз некалькі дзён і то ўвечары, на пасяджэнні камітэта камсамола факультэта.

— Раней нельга было, выконвала камсамольскае даручэнне, — адказала яна на жарт, што выдатнікаў не знойдзеш днём і з агнём. А калі пачула, што яе просяць падзяліцца «сакрэтам» як стаць выдатнікам, збянтэжылася ад нечаканасці.

— Я — як і ўсе астатнія. Мне няма чаго гаварыць аб сваім вопыце, аб сваіх шляхах да выдатніка. Усё проста, звычайна.

Твар дзяўчыны раптам стаў сур'ёзным:

— Біяграфіі яшчэ не паспела нажыць. Дзесяцігодку скончыла з сярэбраным медалем. Пасля сябры ўгаварвалі падацца ў Маскоўскі універсітэт на археалагічны, ды спалохалася. Не простая гэта справа. Падумала, што не выйдзе з мяне археолаг, і — пайшла працаваць. Больш года пасля школы была на камсамольскай рабоце у адным з будаўнічых трэстаў.

Любоў гаварыла так, нібы кожнае слова, важкае і дасціпнае, злятала з нябачных вагаў і дапамагала ўявіць вытокі жыццёвага шляху.

Любоў прыйшла на гістарычны ў 1969 годзе. Трэці год яе партрэт займае пачэснае месца на ганаровай дошцы лепшых студэнтаў-гісторыкаў.

Яшчэ ў школе марыла аб працы настаўніка. Калі іх клас пісаў сачыненне на тэму «Мая будучая прафесія», Люба адзначыла: «Колькі іх, прафесій, на свеце: разнастайных, цікавых, каштоўных! Але лепшую з іх я бачу ў працы настаўніка. Першы крок у жыццё, першае ўражанне аб ім даюць нам, моладзі, школа, настаўнікі. Не бачу больш каштоўнай для сябе працы, як прадаўжаць іх справу, вучыць новае пакаленне.

І вось факультэт... Ці даўно яна была першакурсніцай? Ляцяць гады непаўторнага юнацтва! І чым лепш пражывеш іх, тым лягчэй на душы: «Ёсць аб чым успомніць».

Любоў Ахроменка ўваходзіць у састаў камітэта камсамола факультэта. Дзяўчына ні разу не адмовілася ад камсамольскага даручэння, заўсёды актыўны ўдзельнік ва ўсіх добрых пачынаннях курса. Таварышы гавораць пра Любу: «Чалавек надзейны, сябар нязменны, у бядзе, у горы не пакіне».

— Люба, усё ж у чым сакрэт вашых поспехаў?

— Хочаш быць карысным людзям, умей паважаць іх. А павага да іх — твае веды, твая вучоба на справе, а не на красным слове. Толькі праца, напружаная і асэнсаваная, дапаможа ў гэтым. Яшчэ любоў да будучай справы таксама.

Любоў памаўчала.

— Ну вось і ўсё.

— Дзе б вы жадалі працаваць пасля універсітэта?

— Аб гэтым не задумвалася, часу яшчэ хопіць. Хацелася б дома, у сваёй роднай дзесяцігодцы. А ўвогуле, дзе больш спатрэблюся!

Д. ПЯТРОЎ.

ФІЗІКАЎ

З 19 па 24 красавіка на фізічным факультэце працавала студэнцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная 50-годдзю ўтварэння СССР. Адкрыў яе ўступным словам дэкан факультэта дацэнт І. П. Зяцькоў. Затым былі заслуханы даклады дацэнта І. Г. Родзіна на тэму «Аб значэнні перамагаючага матэрыялізму» — ленінская праграма творчага развіцця навукі» і акадэміка АН БССР М. А. Ельяшэвіча «Філасофскія праблемы сучаснай фізікі».

На факультэце працавала 8 секцый па розных раздзелах фізікі, а таксама секцыі па гісторыі КПСС, палітэканоміі, філасофіі і навуковаму камунізму. Усяго было праведзена 24 пасяджэнні, на якіх заслухана 13 дакладаў па грамадскіх навуках і 115 па фізіцы. Як было адзначана на заключным пленарным пасяджэнні, дзе падводзіліся вынікі канферэнцыі, большасць дакладаў заснавана на самастойных даследаваннях студэнтаў. Многія студэнцкія работы рэкамендаваны да апублікавання ў навуковых часопісах.

На канферэнцыі з дакладамі выступілі студэнты з ДРВ і Афганістана, якія вучацца на фізічным факультэце. У рабоце канферэнцыі прымалі ўдзел таксама студэнты з Азербайджанскага дзяржаўнага універсітэта імя С. М. Кірава.

Прайшоўшая канферэнцыя прадэманстравала высокі ўзровень тэарэтычнай падрыхтоўкі студэнтаў, іх уменне спалучаць добрую вучобу з самастойнымі навуковымі даследаваннямі, што з'яўляецца гарантыяй высокай кваліфікацыі маладых спецыялістаў — выпускнікоў БДУ.

В. ЛУГОЎСКІ,
старшыня савета СНТ фізфака.



Рыхтуецца першамайскі нумар насценгазеты матэматычнага факультэта «Рошым любую задачу».

Фота **Д. Чаховіча.**

ПОШУК МАЛАДЫХ ФІЛОЛАГАЎ

XXIX СТУДЭНЦКАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

Да гэтай канферэнцыі кафедры, навуковыя кружкі, савет СНТ рыхтаваліся загадзя. Праграма яе, якая ўключала больш 120 дакладаў, была старанна прадумана. Усе даклады, рэкамендаваныя кафедрамі на канферэнцыю, былі выкананы на працягу 1971 года ў 12 студэнцкіх навуковых гуртках і ў 40 спецсемінарах пад кіраўніцтвам прафесараў і дацэнтаў, кіраўнікоў гурткоў і семінараў. Многія з увайшоўшых у праграму дакладаў атрымалі на рэспубліканскім аглядзе І і ІІ катэгорыі.

На пленарным пасяджэнні былі заслуханы даклады па тэмах «XXIV з'езд КПСС аб ленінскай дружбе народаў СССР» (Л. Кулак, IV курс), «Паэт і народ» (А. Шаршнёва, III курс), «Традыцыі і наватарства ў лірыцы Янкі Купалы савецкага перыяду» (Т. Пасюк, IV курс), «Ватыкан вачамі атэіста» (Л. Гарбачэўская, V курс), «Іван Мележ і Белдзяржуніверсітэт» (У. Васілевіч, III курс). Навуковае кіраўніцтва гэтымі работамі студэнтаў здзяйснялі дацэнты І. С. Сямыкін, П. І. Ткачоў, І. П. Кахно, прафесар М. Р. Ларчанка, дацэнты В. П. Рагойша, В. М. Цімафеева.

19 і 20 красавіка работа канферэнцыі праходзіла ў васьмі секцыях: беларускай літаратуры, рускай класічнай літаратуры, рускай савецкай літаратуры, зарубежнай літаратуры, беларускай і рускай мовы, агульнага і славянскага мовазнаўства, фальклору, методыкі выкладання рускай і беларускай мовы і літаратуры. У канферэнцыі прыняло ўдзел больш 600 студэнтаў.

Праграма работы ў асноўным выканана. У сваіх справаздачах кіраўнікі секцый адзначаюць сур'ёзны падыход маладых даследчыкаў да актуальных праблем літаратуразнаўства і мовазнаўства, жывую зацікаўленасць студэнтаў да навуковых паведамленняў сваіх таварышаў.

Прыемна адзначыць, што ў канферэнцыі удзельнічалі ў якасці дакладчыкаў як старшакурснікі (О. Сурскова, В. Хвашчэўская, Л. Кушнерава, Л. Зарэмба, Л. Гарбачэўская, І. Фядотава), так і студэнты малодшых курсаў (Л. Тарасюк, Н. Борсук, В. Калечка, А. Пабірухіна, У. Васілевіч, Г. Пашынская, А. Шаршнёва і шмат іншых). Выступілі з дакладамі і студэнты вячэрняга аддзялення.

Вельмі высокую адзнаку атрымалі калектыўныя работы студэнтаў, выкананыя пад кіраўніцтвам прафесара М. Г. Булахава і дацэнта Е. І. Яновіч, прафесара А. Я. Супруна. Гэта даклад «Лексічныя асаблівасці першага Ноўгарадскага летапісу» (Н. Антропаў, С. Дзялец, А. Малюкова, М. Талдонава, Т. Партнова, Л. Паленава) і даклад «Асаблівасці лексікі М. Ю. Лермантава» (А. Стронгіна, І. Кобыш, Т. Скугарэўская, І. Мазаўко, Т. Чарняк).

Калектыўную даследчую работу праводзіць таксама гурток студэнтаў пад кіраўніцтвам дацэнта В. П. Рагойшы, які вывучае гісторыю літаратурнага жыцця ў Белдзяржуніверсітэце. Гэтая работа знайшла сваё адлюстраванне ў серыі дакладаў падсекцыі «Гісторыя універсітэцкага літаратурнага жыцця».

Трэба адзначыць, што ў справаздачах кіраўнікоў секцый ёсць вельмі карысныя прапановы і пажаданні, якія неабходна прыняць да ўвагі савету СНТ факультэта пры падрыхтоўцы да новага рэспубліканскага агляду студэнцкіх навуковых работ і новых канферэнцый.

У рабоце канферэнцыі маладых даследчыкаў прынялі ўдзел госці з Горкаўскага універсітэта імя М. І. Лабачэўскага: І. Становаў, О. Янава, Т. Капітонава. Яны выступілі з цікавымі дакладамі на секцыі зарубежнай літаратуры. А некалькі раней, у сакавіку—красавіку, нашы студэнты былі гасцямі ва універсітэтах Ленінграда, Тарту, Рыгі, Кіева, Львова, Горкага і Калінінграда. Іх даклады атрымалі там станоўчую ацэнку.

Работа канферэнцыі закончана — паўсядзённая ж, сур'ёзная навуковая работа студэнтаў-філолагаў працягваецца.

В. КАХНО,
член партбюро філалагічнага факультэта.

ЯК ГЭТА ЗДАРЫЛАСЯ...

Мне часта задаюць пытанне: «З чаго пачалося ваша захапленне батанікай?» Адразу адказаць на гэтае пытанне нялёгка, таму што не было нейкага рэзкага штуршка. Проста я любіў прыроду, любіў падарожнічаць і, натуральна, не мог быць толькі сузіральнікам, а імкнуўся стаць даследчыкам прыродных багаццяў. Яшчэ ў школе мяне цікавіла: чаму садзяцца матылькі на яркія кветкі і чаму насенне адуванчыкаў на «парашуціках», чаму лісце восенню становіцца жоўтым, а вясной ярка-зялёным? Вельмі хацелася разгадаць гэтыя таямніцы прыроды. З 5-га класа заняўся калекцыяніраваннем мінералаў, насякомых і раслін, займаўся пакаёвым кветкаводствам, спрабаваў праводзіць доследы. Канешне, патрэбны былі парады вопытных людзей, якіх я і знайшоў на станцыі юных натуралістаў.

Калі падышоў да будынка станцыі, крыху сумеўся: «А раптам не прымуць?» Але хутка сумненні рассеяліся. Мяне прынялі вельмі прыветліва і прапанавалі гурток, які мне падабаецца. Выбраў «Кветкаводства». Цяпер можна было наведваць цяпліцу, назіраць і даглядаць расліны. Было вельмі цікава, і я паклікаў да нас у гурток свайго сябра Віктара Маўрышчава. Мы сталі займацца разам. У сёмым класе мы ставілі ўжо такія складаныя доследы, як «Змяненне афарбоўкі антацыана ў шчолачных і кіслотных асяроддзях», методыку якіх самі распрацавалі. Другім нашым вялікім эксперыментам у гэтым годзе было скрыжаванне двух відаў кактуса: эпіфілюма Акермана з эпіфілюмам філантавідным. Нам удалося атрымаць плод, сабраць насенне і высеяць.

Многаму навучыла нас станцыя юннатаў. І галоўнае тое, што яна зрабіла з нас батанікаў - эксперыментатараў.

А дома займаўся самаадукацыяй. Чытаў многа кніг аб раслінах, выязджаў за горад на экскурсіі ў прыроду, збіраў гербарый, вырошчваў дома расліны, а летам, калі ў Мінску адкрылася гарадская выстаўка кветак, удзельнічаў у ёй ад секцыі кветкаводаў-аматараў з экспазіцыяй пакаёвых раслін.

Аб'ектам маёй батанічнай практыкі быў Батанічны сад. Атрымаўшы дазвол на збор гербарыя і назіранні на тэрыторыі сада, я заняўся калекцыяніраваннем расліны. К канцу 1967 года мой гербарый налічваў каля 500 відаў раслін. У гэтым жа годзе адбылася вельмі радасная для мяне падзея: я ўступіў ва Усесаюзнае Батанічнае Таварыства. Для гэтага напісаў сваю першую работу «Фларыстычны нарыс па Мінскаму раёну». Якраз у гэты час ва універсітэце адкрылася школа біёлагаў, і я, запісаўшыся туды, з цікавасцю слухаў лекцыі аб раслінах і жывёлах. Акрамя таго, стаў членам навуковага студэнцкага гуртка пры кафедры сістэматыкі раслін біялагічнага факультэта. Вельмі цікава і плённа праходзілі заняткі. Двойчы на пасяджэннях гуртка выступалі і мы з Віктарам.

А пасля прыйшло захапленне фларыстыкай. Да гэтага і не падазраваў аб яе існаванні. У навукова-даследчым інстытуце эксперыментальнай батанікі я атрымаў доступ да гербарыя Акадэміі навук і вывучаў па яго матэрыялах флору Беларусі. Летам збіраў гербарый вышэйшых раслін, а зімой — гербарый лішайнікаў. У сябе ў школе арганізаваў гурток батанікі. На занятках расказваў рабятам аб гісторыі флоры Беларусі, яе асаблівасцях, вучыў правільна рабіць гербарый, вызначаць расліны. Тады ж прыйшло рашэнне паступіць на біялагічны факультэт БДУ. Рыхтаваўся да гэтага сур'ёзна. Летам, за год да заканчэння школы, працаваў у навукова-даследчым інстытуце эксперыментальнай батанікі Акадэміі навук БССР старшым лабарантам і ўдзельнічаў у трох навуковых экспедыцыях па Беларусі. Сабраў вялікі матэрыял для вывучэння яе расліннасці.

Г. ВЫНАЕЎ,
студэнт IV курса біяфака.

НА СЛАВЯНСКІХ МОВАХ

Традыцыйны вечар дружбы славянскіх народаў на філфаку пачаўся з віктарыны, якая «адправіла» ўдзельнікаў у розныя краіны свету, прымусіла ўспомніць і сур'ёзныя і жартоўныя факты з жыцця славян. Прэміі эрудытам уручаліся тут жа.

У праграму ўвайшлі вершы балгарскіх, польскіх, чэшскіх, югаслаўскіх паэтаў. На серба-харвацкай і рускай мовах гучыць верш «Сіманіда» ў выкананні К. Севярынца. Дарэчы, пераклаў верш ён сам.

А потым пакарылі слухачоў песні. «Новонароджаны» філфака — секстэт «Славела» выконвае адну за другой чэшскія, славацкія, балгарскія песні, а яго ніяк не хочуць адпускаць са сцэны: кранулў ён студэнцкае сэрца мяккім гучаннем галасоў, чулымі адносінамі да слова, мелодыі.

Цікава, весела, з чыста студэнцкім гумарам праспяваў частушкі-весялушкі філалагічны «народны» хор. Народныя балгарскія песні ў выкананні студэнтаў філфака, якім дапамагаў і выкладчык балгарскай мовы У. А. Карпаў, таксама спадабаліся прысутным.

Гарачыя апладысменты заслужыў танцавальны калектыў студэнтак другога курса. «Рускі сувенір», «Украінскі танец» і іншыя, пастаўленыя студэнткай гэтага ж курса Е. Скурко, спадабаліся ўсім.

У вечары прынялі ўдзел студэнты-балгары. Яны выканалі каларытны народны танец.

Замерлі чароўныя гукі песень, не кружацца віхуркі танцаў, апусцела актавая зала філфака, а ў сэрцы шчырая падзяка студэнтам-філолагам, цёплыя ўспаміны і пажаданні яшчэ большых поспехаў.

Б. МІХАЙЛАЎ.

ВАМ, ХІМІКІ

1. Инфракрасные спектры неорганических стекол и кристаллов. Под ред. А. Т. Власова и В. А. Флоринской. Л., «Химия», 1972.

2. Химия гетероциклических соединений. Сборник 3. Рига, 1971.

3. Методы количественного определения органических веществ. Сборник статей. Красноярск, 1971.

4. Процессы синтеза и роста кристаллов и пленок полупроводниковых материалов. Материалы симпозиума. (11—16 октября 1965 г., г. Новосибирск). Новосибирск, «Наука», 1971.

5. Тепло- и массообмен при получении монокристаллов. М., «Металлургия», 1971.

6. Финич, Ж. и др. Основы физической химии. М., «Мир», 1972.

7. Солдатов, В. С. Простые понообменные равновесия. Минск, «Наука и техника», 1972.

8. Натансон, Э. М. и Ульберг, З. Р. Коллоидные металлы и металлополимеры. Киев, «Наукова думка», 1971.

Камісія па правядзенню агляду-конкурсу насценных газет просіць рэдкалегіі да 1 мая вывесіць у карпусах сваіх факультэтаў насценныя газеты, выпушчаныя ў гэтым навучальным годзе.

Камісія.

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

КАЛІ КРОЧЫЦЬ ПОБАЧ ПЕСНЯ

песні і танца. Можна адзначыць новую тэндэнцыю, якая ўсё больш і больш развіваецца,—гэта стварэнне харавых калектываў. За апошні час яны ўзніклі на філалагічным і біялагічным факультэтах.

Актыўны ўдзел прынялі ў аглядзе выкладчыкі універсітэта.

Жадаючых пачуць вынікі агляду і паглядзець заключны канцэрт прыйшло шмат.

Закончыўся агляд мастацкай самадзейнасці факультэтаў, прысвечаны 50-годдзю ўтварэння СССР. Ён яшчэ раз даказаў, якую вялікую ролю адыгрывае мастацтва ў студэнцкім жыцці: дапамагае не толькі ў вучобе і адпачынку, але і выхоўвае добры эстэтычны густ, любоў да народнай

Амаль усе лаўры па заслугах дасталіся філолагам. Па-першае — за масавасць, па-другое — за выканаўчае майстэрства і арганізаванасць. Журы аднадушна прысудзіла філалагічнаму факультэту I месца, а прафкам уручыў прыз за масавасць. II месца занялі біёлагі, III — географы і юрысты. Многія ўдзельнікі агляду былі ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі.

А потым канцэртную справаздачу далі самадзейныя артысты. Спадабаліся слухачам песні ў выкананні хору філалагічнага факультэта. І перш за ўсё шчырасцю выканання. З задорам і весялосцю спявалі салісты Л. Яроха і У. Ламека.

Сапраўднай тэатральнасцю вызначылася танцавальная група хімікаў, якая паказала вясковую «Кадрыль» і іншыя танцы. Як заўсёды, горача прымалі слухачы Марыну Багрый - Шахматаву. Урыўкі з твораў Горкага ў яе выкананні зачаравалі ўсіх. Ёй быў уручан прыз «Лепшаму дэкламатару».

Жаданымі гасцямі на канцэрце былі студэнты падрыхтоўчага факультэта. «Рускае поле»... — спявае в'етнамскі студэнт Ву-Чунь-Тхеу. У яго голасе гучаць любоў і пяшчота да сваёй другой радзімы, боль за пакуты роднай в'етнамскай зямлі. Падарыў рускім сябрам сваю новую песню кубінец Рауль Корціна. Свае нацыянальныя танцы выканалі студэнты з Конга і Алжыра.

Агляд закончыўся. Ён паказаў, наколькі ўзрос талент самадзейных артыстаў. Хай жа мастацкі пачатак яшчэ больш аздухатварае вашу вучобу і працу, сябры!

Л. ПЕРАСЫПКІНА.

НА ЗДЫМКУ: выступае хор філалагічнага факультэта.

Фота **Д. Чаховіча.**

МАЙ ЗЯМНОЕ ШЧАСЦЕ РОДЗІЦЬ...

ВЫРАЙ

Любоў ТАРАСЮК

Чуйна заспаным стрэхам
Рушылі. Сон прачы.
Падалі ў рэчку рэха
Звонкія абручы.

Неба над самым
плёсам, —
Пойдзе, не пойдзе на
дно?
Цяжка спадалі косы
Мокрыя на рэдно.

І трапяталі хусткі
Белым, як дзень, крылом.
Кладкай старой і вузкай
Шэрае неба прайшло.

Памяць забытай скрусе
Выстукалі прачы.
Неслі блакіты гусі,
Вецер крылом б'ючы.

***

Прамоклі тонкія таполі,
А дождж цяжкі — усё шпарчэй.
І без лістоў сумуе голле,
Бы не абуджана яшчэ.

Марудна цягнуцца хвіліны,
Як па рэцэ стары паром...
Ды ўздрыгануць урэз галіны,
Як спудзіць цішу першы гром.

У завязі заб'ецца кволай
Няўмольнай сілаю адчай,
Нібы дзядоў пачуўшы голас,
Што ранні гром — на неўраджай.

Анатоль ШУШКО

І ТЫ ІДЗІ...

І ты ідзі, пакуль відаць сляды
Твайго маленства, свежыя,
як лісце,
Дзе ўспамінам — кропелька
вады,
Што—важкая—з галінкаю
адвісне,
А ты чакаеш: звяліцца ці не?
Баішся, нібы міг таго палёту,
Што разаб'ецца на імшыстым
дне
Сівога бору, агарне сумотай.
І ты, адзіны, на зыходзе дня
Адчуеш прагна, як далёка недзе
Брыдзе праз час святая цішыня,
Каб хтось шчаслівым быў
у гэтым
свеце.

***

ПРАДВЕСНЕ

І мроіцца снягам —
Аб даўнім, дзіўным леце...
І босая нага
Ступае па суквецці.

І цёпла маразам...
Рамонкавае поле.
Як летняя раса,
Сняжынка ў прыполе...

Мікола ЦЯЛЕГА

ЦІШ І ГОМАН

Размаўляю — ціш густая,
Засынаю — гоман сноў.
Ціш навалай прарастае,
Нібы белы свет—акном.

Мы чакаем, бо ўсе знаем,
Што імгненне ў кожным дні
Кроны ясныя кранае
І бунтуе карэні.

Толькі вечнае гібенне
Лісцяў з недапетых рэй
Завяршае абнаўленне —
Вечны звон і цішу — дрэў.

Свет нанова адкрываю,
Што імкнецца надысці.
І заўсёды паланае
Ціш і гоман у жыцці.

Паліна ХАРЭВІЧ

ПАВЕР'Е

Нявер'е згіне — услыхне радасць,
Пераплятуцца рукі ў згодзе,
Жывым пытальнікам на зайздрасць
Ля іх шчаслівымі мы пройдзем.

І казка-мара явай стане,
У снежні май зямлю атуліць,
За нас вясна кілішак ранні
Бярозавіку перакуліць.

Успомнім мы тады павер'е,
Што май зямное шчасце родзіць.
О, толькі згінула б нявер'е,
Перапляліся рукі ў згодзе!..

ВЯСЕННІ ЭЦЮД. Фота **Л. Калюжнай.**

УСМЕШКІ МАСТАКА



Вытворчае навучанне.





Без слоў.

УСМЕШКІ МАСТАКА



АТ 02173
Зак. 522

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон — 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

Тыраж 2 000 экз.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.